©БДУКМ

# ЭТНАКУЛЬТУНАЯ ДАМІНАНТА ТВОРЧАСЦІ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА

***У. А. ЖЫЛКО,*** **А. І. СМОЛІК**

The article is devoted to the analysis of the dominant of the Belorusian's' ethnic culture, identified in the creative work of Jan Barscheusky. The author reveals the semantic objects in the literary texts of J. Barscheusky, which are incorporated into a system of the variety of the cultural meanings

Ключавыя словы: этнічная культура, карціна свету, сімвалы, аксіялагічны змест

Праблема этнаспецыфічных кампанентаў культуры на сённяшні дзень займае вядучае месца ў галіне культуралагічных ведаў. Гэта тлумачыцца тым, што яна ахоплівае фундаментальныя аспекты функцыянавання этнасу – найперш тыя, што звязаны з яго самаідэнтыфікацыяй. Таму на дадзены момант падаецца мэтазгодным зварот да этнакультурных кампанентаў у творах мастацкай літаратуры. Творчасць Я. Баршчэўскага выступае мастацкім увасабленнем беларускага вобраза свету. У якасці сістэмаўтваральнага ядра этнічнай культуры беларусаў намі выдзелена катэгорыя карціны свету.

Карціна свету прадстаўніка беларускага этнасу базуецца на сімвалічных структурах народнага светапогляду і аксіялагічных катэгорыях. Сімвалічны змест твора «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» прадстаўлены прасторавымі архетыпамі, сімволікай птушынага і жывёльнага свету, стваральных стыхій, а таксама прадстаўнікоў «іншасвету». Карціна свету тагачаснага этнічнага беларуса базавалася на міфапаэтычным успрыняцці рэчаіснасці, што абумоўлівае сувязь канатацыі многіх этнічных сімвалаў з падзелам прасторы на «свой», «гэты» і «чужы», «той» свет.

Заснаваны на упарадкаванасці і ўстойліваасці «свой» свет утрымлівае ў сваіх межах сімвалы пазітыўнай канатацыі: дом, сад, Сусветнае дрэва (дуб), зямля, Плачка (персаніфікаваны архетып Маці-Радзімы), старац («божы» чалавек). У сваю чаргу «чужы» іншасвет у народнай свядомасці характарызаваны даволі няпэўна і неакрэслена, вылучаецца бесструктурнасцю і спустошанасцю, чым выклікае страх і насцярожанасць у этнічнага беларуса. Яскравымі носьбітамі дэструктыўных тэндэнцый і хаосу выступаюць прыхадні-чужынцы, якія часцей за ўсё аказваюцца чараўнікамі і чарнакніжнікамі. Тое самае датычыцца і градацыі жывёльнага свету у Сусветным дрэве, дзе прадстаўнікі ніжэйшага яруса: змеі, жабы, вусякі маюць яскравую адмоўную канатацыю.

Поруч з сімваламі адным з функцыянальных кампанентаў этнічнай культуры з'яўляюцца этнічныя каштоўнасці. Сярод іх цэнтральнай і вызначальнай для ўсіх астатніх выступае Бог. Вера ў Бога ў творы з'яўляецца сімвалам вечнасці, каштоўнасным арыенцірам, своеасаблівым пунктам адліку, вакол якога працякае жыццё беларуса з усімі яго прыватнымі каштоўнасцямі і ідэаламі.

Глыбока аналізуецца ў зборніку такая каштоўнасць, уласцівая беларускаму этнасу, як праца. Традыцыйная культура беларусаў цесна звязана з асаблівасцямі земляробчага цыклу: фактычна існаванне чалавека спрадвеку вызначалася працай на зямлі. Зямля лічылася крыніцай існавання, галоўнай каштоўнасцю. Архетып зямлі цесна звязаны з культам продкаў. Продкі, згодна беларускай традыцыі, заўжды лічыліся святымі, а памяць пра мінулае – неад'емнай часткай жыцця сённяшняга, абавязковым элементам існавання чалавека ў свеце.

Да аксіялагічных катэгорый этнічнай культуры беларусаў, выяўленых у творчасці Яна Баршчэўскага, цесна прымыкаюць такія дамінантныя рысы беларускага нацыянальнага характару, якія маюць этычную афарбоўку: *справядлівасць*, *сумленнасць*, *годнасць*, *сціпласць*, *праўдалюбства*, і атрымліваюць ў творы выразнае каштоўнаснае асэнсаванне.

Такім чынам, у творчай спадчыне Я. Баршчэўскага на аснове выяўлення ў ёй этнакультурнай дамінанты (яе сімвалічнага і аксіялагічнага складнікаў) рэльефна праявілася даўняя здольнасць беларускай ментальнасці арганічна спалучаць рысы хрысціянства і язычніцтва, своеасаблівым чынам сінтэзуючы іх у сістэме светапогляду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ